Цана 10 кап. (грош.)

Пролетары ўсіх краін, еднайцеся!

Орган Часовага Упраўлення гор. Вільно

ВІЛЕНСКАЯ ПРАЎДА


№ 8
30 верасня 1939 г.
субота



Народны Камісар Абароны, першы маршал Савецкага Саюза таварыш Кліменцій Ефрэмавіч Варашылаў



Генеральны сакратар Цэнтральнага Камітэта Усесаюзнай Комуністычнай Партыі (большэвікоў) таварыш Іосіф Вісарыёнавіч Сталін



Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР і Народны Камісар Замежных Спраў таварыш Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў

К заключэнню германа-совецкага дагавора аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй

На працягу 27—28 верасня ў Маскве адбываліся перагаворы паміж Старшынёй Соўнаркома СССР і Народным Камісарам Замежных Спраў тав. Молатавым і Міністрам Замежных Спраў Германіі г. фон Рыбентропам па пытанню аб заключэнні германа-совецкага догавара аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй.

У перагаворах прымалі ўдзел таварыш Сталін і совецкі паўпрэд у Германіі таварыш Шкварцэў, а з боку Германіі—германскі пасол у СССР г. Шуленбург.

Перагаворы закончыліся падпісаннем германа-совецкага дагавора аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй і заявай урадаў СССР і Германіі, а таксама абменам пісьмамі паміж таварышам Молатавым і г. фон-Рыбентропам па эканамічных пытаннях. Ніжэй прыводзяцца адпаведныя дакуманты.

Германа-совецкі дагавор аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй

Урад СССР і Германскі ўрад пасля распаду былой Польскай дзяржавы разглядаюць выключна як сваю задачу аднавіць мір і парадак на гэтай тэрыторыі і забяспечыць народам, якія там жывуць, мірнае існаванне адпавядаючае іх нацыянальным асаблівасцям. З гэтай мэтай яны прыйшлі да пагаднення ў наступным:

I

Урад СССР і Германскі ўрад устаноўліваюць у якасці граніцы паміж абаюднымі дзяржаўнымі інтарэсамі на тэрыторыі былой Польскай дзяржавы лінію, якая нанесена на прыкладаемую пры гэтым карту і больш падрабязна будзе апісана ў дадатковым пратаколе.

II

Абедзве стораны прызнаюць устаноўленую ў артыкуле I граніцу ўзаемных дзяржаўных інтарэсаў канчатковай і ўстараняць усякае ўмяшацельства трэціх дзяржаў у гэта рашэнне.

III

Неабходную дзяржаўную перабудову на тэрыторыі заходней указанай у артыкуле I лініі праводзіць германскі ўрад.

На тэрыторыі ўсходней гэтай лініі—урад СССР.

IV

Урад СССР і Германскі ўрад разгледжваюць вышэйпрыведзеную перабудову як надзейны фундамент для далейшага развіцця прыяцельскіх адносін паміж сваімі народамі.

V.

Гэты договар належыць ратыфікацыі. Абмен ратыфікацыйнымі граматамі павінен адбыцца магчыма хутчэй у Берліне.

Дагавор уступае ў сілу з моманту яго падпісання.

Складзен у двух арыгіналах, на нямецкай і рускай мовах.

Масква, 28 верасня 1939 г.
По ўпаўнамоцтву Ўрада СССР
В. Молатаў.
За ўрад Германіі
І. Рыбентроп.

Заява Совецкага і Германскага ўрадаў ад 28 верасня 1939 г.

Пасля таго, як германскі ўрад і ўрад СССР падпісаным сёння догаварам канчаткова ўрэгулiравалі пытанні, узнікшыя ў рэзультаце распаду Польскай дзяржавы, і тым самым стварылі моцны фундамент для працяглага міру ва Ўсходняй Еўропе, яны ва ўзаемнай згодзе выражаюць думку, што ліквідацыя сучаснай вайны паміж Германіяй з аднаго боку і Англіяй і Францыяй з другога боку адказвала-б інтарэсам усіх народаў. Па гэтаму абодва ўрады накіруюць свае агульныя намаганні, у выпадку патрэбы ў згодзе з іншымі прыяцельскімі дзяржавамі, каб магчыма хутчэй дасягнуць гэтай мэты. Калі, аднак гэтыя намаганні абодвух урадаў застануцца беспаспяховымі, то такім чынам будзе ўстаноўлен факт, што Англія і Францыя нясуць адказнасць за прадаўжэнне вайны, прычым, у выпадку прадаўжэння вайны ўрады Германіі і СССР будуць кансультыравацца адзін з другім аб неабходных мерах.

По ўпаўнамоцтву Ўрада СССР
В. Молатаў.
За Германскі Урад
І. Рыбентроп.
28 верасня 1939 года.

Масква 28 верасня 1939 года. Германскаму Міністру Замежных Спраў г. Іоахіму фон-Рыбентропу У сучасны момант у Маскве.

Гаспадзін міністр, —

Спасылаючыся на нашы перагаворы, мы маем чэсць пацвердзіць Вам, што Ўрад СССР на падставе і ў духу дасягнутага з Вамі агульнага палітычнага пагаднення поўны волі ўсямерна развіць эканамічныя адносіны і таваразварот паміж СССР і Германіяй. З гэтай мэтай абедзвюма старанамі будзе складзена эканамічная праграма, згодна якой Совецкі Саюз будзе дастаўляць Германіі сыравіну, якую Германія ў сваю чаргу будзе кампенсіраваць прамысловымі пастаўкамі, вытвараемымі на працягу доўгага часу. Пры гэтым абедзве стораны пабудуюць гэтую эканамічную праграму такім чынам, каб германа-совецкі таваразварот па сваіх размерах зноў дасягнуў вышэйшага аб'ёму, дасягнутага ў мінулым.

Абодва Ўрады дадуць неадкладна неабходныя распараджэнні аб правядзенні вышэй указаных мер і паклапоцяцца аб тым, каб перагаворы, як мага хутчэй, пачаліся і былі даведзены да канца. Прыміце, гаспадзін Міністр, паўторнае запэўненне ў поўнай маёй павазе.

В. Молатаў.

У адказ на пісьмо тав. Молатава ад 28 верасня атрымана пісьмо ад Міністра Замежных Спраў Германіі гаспадзіна фон-Рыбентропа, дзе ўказваецца, што Германскі ўрад згодзен даць усе неабходныя распараджэнні ў духу пісьма таварыша Молатава.

АРК. ГЕИНЕ.

СУСТРЭЧА БРАТОЎ

Тут дваццаць год скрозь лес дрымотны
Змяёй граніца пралягала:
З аднога боку—край гаротны;
З другога—шчасце расцвітала.

І дваццаць год два родных брата
Былі разлучаны мяжою:
Адзін — пад панскаю пятою;
Другі — свабодны — жыў багата.

Адна зямля: балоты, нівы,
Лясных гушчараў таямніцы,
Азёры, воды рэк шумлівых —
І ўсё падзелена граніцай.

Нястала сіл цярпець знямогу,
Гібець у цяжкай, зморчнай долі,—
І брат, закованы ў няволі,
Паклікаў брата на падмогу.

Руку магутную падмогі
Палаў свабодны воін брату;
Ударам моцным прэч з дарогі
Ён змёў драпежнікаў і катаў...

І жыць адной сям'ёю сталі
Ізноў браты у родным краі...
На іх братэрства бацька Сталін
З усмешкай цёплай пазірае.

Верасень, 1939 г.

—:::—

Аператыўная зводка генеральнага штаба Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

29 верасня 1939 года.

Часці Чырвонай Арміі, прадаўжаючы прасоўванне да дэмаркацыйнай лініі, на працягу 28 верасня вышлі на лінію: Граева, Чыжэў (На паўднёвы захад ад Мазавецка 20 км.), Межырэчча, Крэнпец (на паўднёвы ўсход ад горада Любліна 12 км.), Шчэбрэшын, Малодыч (на паўночны захад ад Любачава 15 км.), Перэмышль, Устржыкід (на паўднёвы захад ад Перамышля 40 км.).

Прадаўжаючы аперцыі па ліквідацыі рэшткаў польскіх войск у Заходняй Беларусі і ў Заходняй Украіне, часці Чырвонай Арміі раззброілі і ўзялі ў палон 5 кав. палкоў з 15 артылерыйскімі гарматамі ў раёне Крукеніцэ і акрамя таго ліквідавалі асобныя групы польскіх часцей.

(ТАСС.).

—:::—

У апошнюю мінуту

Заява міністра замежных спраў Германіі г. фон Рыбентропа супрацоўніку ТАСС

Перад ад'ездам з Масквы міністр замежных спраў Германіі г. фон-Рыбентроп зрабіў супрацоўніку ТАСС наступнае заяўленне: „Маё прабыванне ў Маскве зноў было кароткім, нажаль, вельмі кароткім. Наступным разам я спадзяюся пабыць тут даўжэй. Тым не менш мы добра выкарысталі гэтыя два дні. Было выяснена наступнае:

1. Германска-совецкая дружба цяпер устаноўлена канчаткова.

2. Абедзве краіны ніколі не дапусцяць да ўмяшання трэціх дзяржаў ва ўсходня-еўрапейскія пытанні.

3. Абедзве дзяржавы жадаюць, каб быў устаноўлены мір і каб Англія і Францыя спынілі абсалютна бессэнсоўную і бесперспектыўную барацьбу супроць Германіі.

4. Калі аднак у гэтых краінах возьмуць верх падпальшчыкі вайны, то Германія і СССР будуць ведаць, як адказаць на гэта".

Далей міністр указаў на дасягнутае ўчора пагадненне паміж урадам Германіі і ўрадам СССР аб шырокай эканамічнай праграме, якая прынясе выгаду абодвум дзяржавам.

У заключэнне г. фон-Рыбентроп заявіў: „Перагаворы прахадзілі ў асабліва сардэчнай і найлепшай атмасферы. Аднак, перш за ўсё, я хацеў-бы адзначыць сардэчны прыём, аказаны мне Совецкім Урадам і асабліва г. г. Сталіным і Молатавым".

(ТАСС)

Мастацкая чырвонаармейская самадзейнасць — вялікая выхаваўчая сіла

26 верасня Ансамбль чырвонаармейскай песні і пляскі Беларускай Асобай Ваеннай Акругі даў канцэрт для працоўных горада Вільно. Канцэрт быў горача сустрэт усімі прысутнымі.

Пасля кожнага выступлення з зала раздаваліся бурныя апладысменты, пераходзіўшыя ў авацыю.

Ніжэй мы публікуем асобныя выступленні ўдзельнікаў ансамбля і водгукі слухачоў — рабочых фабрыкі „Электрыт".

Канцэрт, які саграває душу

18 верасня ансамбль чырвонаармейскай песні і пляскі Беларускай Асобай Ваеннай Акругі выехаў на Беларускі фронт для абслугоўвання часцей Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Адначасова ансамбль дае канцэрты і для працоўных Заходняй Беларусі. Цёпла і прыветліва сустракаюць працоўныя наш калектыў, у асобе якога яны бачаць росквіт культуры Чырвонай Арміі, росквіт культуры народаў Совецкага Саюза. Выконваемыя песні аб Сталіне, аб Народным Камісару Абароны таварышу Варашылаве вызываюць доўга незмаўкаючыя апладысменты. З месц чутны воклічы: „Няхай жыве таварыш Сталін!" „Няхай жыве Чырвоная Армія" і па зале разносіцца гучнае „Ура!"

У сваім рэпертуары ансамбль мае і беларускія песні, як напр.: „А ў полі верба", „Бывайце здаровы, жывіце багата" і іншыя. Гэтыя песні асабліва хвалююць слухача.

„46 год я працую машыністам сцэны, але такое відовішча я ўбачыў упершыню" — так заяўляе работнік тэатра „Марс" г. Вільно, Такія заявы прыходзіцца чуць вельмі часта. Тов. Субач з м. Вялейкі кажа: „Сённешнім канцэртам нашы браты сагрэлі нашу душу, далі нам энергію і сілы на далейшую барацьбу за светлую будучыню"...

Чырвоная Армія бліскуча выконвае пастаўленую перад ёю Совецкім Урадам задачу ў вызваленні працоўных Заходняй Беларусі з-пад гнёту польскіх паноў. Ансамбль, як баявая адзінка, разам з Чырвонай Арміяй выконвае гэтую адказную і ганаровую задачу.

Камісар Н-ай часці ў падзяку за наш канцэрт заявіў: „Дзякую вам, таварышы. Вы натхнілі нас на яшчэ лепшае выкананне задачы, пастаўленай перад намі партыяй і Совецкім Урадам у вызваленні працоўных Заходняй Беларусі і мы запэўняем партыю, Урад і таварыша Сталіна, што гэта задача будзе да канца намі выкана з чэсцю.

Удзельнік ансамбля

Е. Салдатаў.

Артысты ў мундзірах.

26 верасня, першы раз у жыцці я наведаў канцэрт ансамбля чырвонаармейскай самадзейнасці і быў здзіўлены вялікім мастацтвам чырвоных байцоў—артыстаў у мундзірах. Такога ансамбля не маглі стварыць прыгнечаныя бяспраўныя салдаты буржуазных краін. Публіка была ў захапленні і сваю падзяку выразіла ў гарачых і доўга незмаўкаючых апладысментах. Гледачы выражалі сваю ўдзячнасць Совецкаму Ураду і таварышу Сталіну, даўшым магчымасць такога нячаканага росквіту культуры і мастацтва вялікага свабоднага совецкага народа.

Юлій Рацан.

—:::—

Адважныя воіны і талантлівыя артысты

Канцэрт Ансамбля чырвонаармейскай песні і пляскі наглядна паказаў нам, што байцы Чырвонай Арміі з'яўляюцца не толькі адважнымі і адданымі воінамі, але і выдатнымі аратарамі і талантлівымі артыстамі. Я быў у захапленні ад таго, што бачыў і прыношу сваю падзяку чырвонаармейцам-артыстам за выдатны і захапляючы канцэрт.

Рабочы фабрыкі «Электрыт»

Хаім Каган.

Магутнасць і таланты Чырвонай Арміі

26 верасня першы раз у сваім жыцці я прысутнічаў на канцэрце, які даваў Ансамбль чырвонаармейскай песні і пляскі.

Я не магу лічыць сябе вялікім знатаком мастацтва і музыкі ў асаблівасці, але вялікае майстэрства гэтых выдатных артыстаў-любіцелей прывяло мяне ў захапленне.

Я змог ацаніць магутнасць і талант Чырвонай Арміі і зразумеў, што існуе другое, вялікае мастацтва, якое магло развіцца толькі ў вольнай, вялікай краіне Советаў.

Рабочы фабрыкі „Электрыт"

Майсей Шніпеліцкі.

—:::—

Незабыўны канцэрт

Канцэрт ансамбля чырвонаармейскай песні і пляскі зрабіў на мяне вялікае ўражанне. Я не мог і падумаць, што з чырвонаармейцаў-франтавікоў можна стварыць мастацкі ансамбль, які праявіць столькі майстэрства, ўкладзе ў іх столькі пачуццяў і мастацкай праўды.

Выдатнае выкананне песень, не шаблоннае, а свежае, арыгінальнае, застаўляючае слухача адчуць непасрэдную сувязь з артыстамі, выключная пастаноўка танца, а асабліва само жыццё, якое б'е крыніцай у выступленнях ўдзельнікаў ансамбля, зрабілі на мяне ўражанне, аб якім я ніколі не забуду.

У. Заблудоўскі.

Усё перамагаючая сіла вольнага совецкага мастацтва.

Пасля першага вольнага схода, без удзелу агентаў і паліцэйскай ахранкі, адбыўся канцэрт. Мы думалі, што выступяць артысты і актрысы ў грыме і касцюмах.

Якое-ж вялікае было наша здзіўленне, калі на сцэне паявіліся ззяючыя твары нашых вызваліцелей-чырвонаармейцаў. У сваім кароткім уступе канферансье расказаў сабраўшымся, што чырвонаармейцы ўмеюць не толькі выйграваць сражэнні, а і культурна праводзіць свой вольны час. З гэтай мэтай былі створаны ансамблі чырвонаармейскай песні і пляскі.

Першым нумарам мы праслухалі песню аб Сталіне, твор вядомага кампазітара прафэсара Александрава. І ўжо пасля гэтай першай песні мы ўпэўніліся ў высокай мастацкай пастаноўцы ўсяго хора.

Углядваючыся ў радасныя твары чырвонаармейцаў - артыстаў, мы ўпэўніваліся, што песня імі не проста праспявана, кожны баец глыбока адчуў змест гэтай песні.

Як прыгожа прагучэў адрывак з оперы „Демон" і ўжо знаёмая нам, віленчанам, „кукушка".

Але не толькі прыгожа могуць спяваць чырвонаармейцы. Іх пляскі не менш захапляючыя.

Так выконваць народныя песні і пляскі ўмеюць толькі чырвонаармейцы.

Захапленне гледачоў мімаволі выражаецца ў бурным усеагульным воклічы:

„Няхай жыве ўсёперамагаючая, спяваючая і танцуючая Чырвоная Армія!"

Б. Жысьлін.

Акружаныя увагай таварыша Варашылава

Перамога соцыялізма ў нашай краіне забяспечыла нябачанае развіццё совецкага мастацтва. Краіна стварыла дзесяткі і сотні розных тэатраў, мае некалькі тысяч абсталяваных кіно-тэатраў.

Адчынены дзесяткі, сотні тэатральных, музыкальных і іншых навучальных устаноў і школ, у якіх вучацца і выхоўваюцца тысячы будучых работнікаў мастацтва.

Краіна мае некалькі тысяч клубаў.

Совецкая Улада стварыла ўмовы для развіцця культуры рэспублік і нацыянальнасцей, насяляючых Совецкі Саюз. Аб велізарным росце гэтай культуры сведчаць праведзеныя ў Маскве дэкады мастацтва нацыянальных рэспублік.

Перамога совецкіх піяністаў, скрыпачоў на сусветных конкурсах з'яўляецца яскравым паказальнікам росквіта культуры нашага народа.

Чырвоная Армія, якая з'яўляецца крывёю і плоццю народа, уцягвае ў сябе ўсё найлепшае, што мае народ, згуртоўвае найлепшых яго прадстаўнікоў.

Разам з ростам культуры краіны расце культура Чырвонай Арміі, яе байца. Яна мае магутную сетку клубаў, дамоў Чырвонай Арміі, дзе разгортваецца масавая культурная і палітычная работа.

Вялікую ўвагу чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці удзяляе Народны Камісар Абароны таварыш Варашылаў. Па яго загаду ўведзены ў штат арміі ансамблі чырвонаармейскай песні і пляскі для лепшага абслугоўвання байцоў і камандзіраў. Апрача таго Чырвоная Армія мае такі магутны калектыў выканаўцаў з 250 чалавек, як чырвонасцяжны ансамбль чырвонаармейскай песні і пляскі пад мастацкім кіраўніцтвам прафесара ордэнаносца Александрава, які створан і выпеставан непасрэдна таварышамі Сталіным і Варашылавым.

Саліст ансамбля В. Сарокін.

Таланты народа

Канцэрт, які быў дан 26 верасня Ансамблем чырвонаармейскай песні і пляскі, быў новай і нязвычайнай падзеяй для гледачоў-працоўных горада Вільно. Ён паказаў, што совецкае мастацтва стаіць на вельмі высокім узроўні. Гэтыя народныя таланты могуць стварацца толькі ў краіне квітнеючага соцыялізма.

Северын Фрыдман.



Выступленне Ансамбля чырвонаармейскай песні і пляскі у горадзе Вільно.
На здымку: група удзельнікау Ансамбля выконвае «Чырвонаармейскую пляску».

Фото Сапіра і Дабравольскага.

Ансамбль Чырвонаармейскай песні і пляскі БАВА

У студзені 1938 года па ініцыятыве Ваеннага Совета Беларускай Асобнай Ваеннай Акругі быў створан Ансамбль чырвонаармейскай песні і пляскі БАВА пад мастацкім кіраўніцтвам маладога талантлівага музыканта-харавіка Александра Усачова. У склад ансамбля ўвайшлі лепшыя выканаўцы, спевакі, танцоры і музыканты, адабраныя на алімпіядах чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці. К 20-й гадавіне РСЧА, г. зн. за адзін месяц работы, была падрыхтавана першая канцэртная праграма з 20 твораў совецкіх кампазітараў рускіх народных песень і твораў сусветнай класікі, як „Казачья дума о Сталіне" муз. Калеснікава, „Хор спутников" — муз. Рубінштэйна і інш.

Былі таксама падрыхтаваны дзве масавыя чырвонаармейскія пляскі ў пастаноўцы В. Іўліева.

З 23 лютага пачаліся рэгулярныя канцэрты ансамбля. К гэтаму часу ансамбль меў у сваім складзе каля 30 чалавек выканаўцаў. Працаваць прыходзілася многа. Патрэбна было абслугоўваць воінскія часці акругі і адначасова вучыцца і ствараць новы рэпертуар. Малады калектыў, у сваёй большасці—комсамольцы, не баючыся цяжкасцей, па-бальшэвіцку ўзяўся за авалоданне майстэрствам песні і пляскі.

Увесь час будучы ў раз'ездах па самых аддалёных кутках Беларускай Ваеннай Акругі, ансамбль за 1 год работы даў больш як 250 канцэртаў.

К 1-й гадавіне свайго існавання ансамбль атрымаў высокую ацэнку сваёй работы і быў узнагароджан Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР ганаровай граматай. Граматамі Вярхоўнага Совета БССР і імяннымі каштоўнымі падаркамі былі ўзнагароджаны ўдзельнікі ансамбля т. т. Усачоў, В. Сарокін, В. Гаўрылаў, Г. Наскоў і інш. Высокая ўзнагарода Ўрада яшчэ больш натхніла калектыў на авалоданне культурай, майстэрствам песні і пляскі, дала штуршок к новаму творчаму ўздыму калектыва. Побач з работай па падрыхтоўцы рэпертуара, канцэртаў, у калектыве вялася рэгулярна вайсковая і палітычная падрыхтоўка.

Кожны ўдзельнік ансамбля заўсёды быў гатоў стаць са зброяй у руках на абарону граніц сваей любімай радзімы.

Цяпер ансамбль у сваім складзе налічвае 70 выканаўцаў—спевакоў, музыкантаў і танцораў. Рэпертуар ансамбля багаты і разнастайны. У нашым рэпертуары каля 100 харавых твораў і 6 масавых плясак, як напр.: чырвонаармейская казачая пляска ў пастаноўцы чырвонаармейца В. Гаўрылава, пляска тачанка, руская пляска і інш.

За перыяд свайго існавання ансамбль правёў вялікую работу па культурнаму абслугоўванню байцоў і камандзіраў БАВА і працоўнага насельніцтва БССР, Орлоўскай, Заходняй і Калінінскай абласцей РСФСР.

Усяго ансамбль даў 425 канцэртаў, якія карысталіся ўсюды вялікай папулярнасцю.

Калектыў таксама вядзе рэгулярную работу па аказанню дапамогі чырвонаармейскай самадзейнасці ў часцях. Ён дае кансультацыю маладым чырвонаармейскім калектывам.

Цэлы шэраг удзельнікаў ансамбля, як Пеккун, Панамарэнка і інш., маюць падзякі ад камандвання часцей за дапамогу чырвонаармейскай самадзейнасці.

Многія ўдзельнікі ансамбля заметна выраслі ў калектыве і сталі ядрэннымі майстрамі песні і пляскі. Так, комсамолец-баяніст І. Фаленкаў прышоў у калектыў не спрактыкаваным музыкантам. Цяпер т. Фаленкаў з'яўляецца перадавіком музыкальнай групы ансамбля. Комсамолец В. Гаўрылаў кіруе танцавальнай групай ансамбля. Комсамолец В. Сарокін прышоў у калектыў з высокімі галасавымі данымі, але не меў тэхнікі і пастаноўкі голоса. Цяпер ён з'яўляецца салістам ансамбля.

Комсамольцы Волкаў В., Шпакоўскі В. і Недарэзаў А. раней не спявалі ў хорах, а цяпер таксама з'яўляюцца салістамі ансамбля.

Выраслі і комсамольцы т. т. Смышляеў, Панамарэнка, Салдатаў, Петухоў і др.

Дзякуючы настойлівай рабоце калектыва, дзякуючы штодзённаму кіраўніцтву камандвання, Палітупраўлення БАВА, ансамбль вырас у буйную мастацкую адзінку.

Байцы і камандзіры любяць свой баявы ансамбль, які з'яўляецца плоць ад плоці, кроў ад крыві дзецішчам народа, дзецішчам перамогшага соцыялізма.

Удзельнік Ансамбля

Г. Фралоўскі.

Першыя крокі работы Сялянскага Камітэта

Раніца. Таварыш Слізень пачынае рабочы дзень. У яго вельмі многа работы. Ён з'яўляецца Старшынёй Сялянскага камітэта ў вёсцы Порплішчы, Дзісненскага павета.

Кожны дзень будынак, дзе знаходзіцца камітэт, перапоўнен сялянамі. Жыхары прыходзяць сюды, каб вырашыць набалелыя пытанні. Асаблiва сяляне цікавяцца сельска-гаспадарчымі пытаннямі. Як і чым засяваць атрыманую зямлю, дзе дастаць каня, інвентар.

На гэтыя пытанні старшыня камітэта таварыш Слізень адказвае справамі, задавальняе іх просьбы. Напрыклад, селяніну Івану Даговічу для сяўбы выданы дзесяць пудоў жыта, а групам сялян для апрацоўкі зямлі выданы коні, сельскагаспадарчы інвентар, бескароўным дадзены дойныя каровы.

Паміж членамі камітэта размеркаваны функцыі. Кожны член камітэта ведае, за што ён адказвае.

Член сялянскага камітэта таварыш Субач адказвае за сельскагаспадарчыя работы. Ён праводзіць учот усей панскай маёмасці, а член камітэта тав. Валцэвіч адказвае за нармальную работу прадпрыемстваў. Тав. Місюль за своечасовае забеспячэнне школ неабходнымі матэр'яламі, падручнікамі, пісьмовымі прыладамі. Ён жа займаецца падборам выкладчыкаў.

Ёсць ужо рэзультаты работы. З 25 верасня пачалі нармальна працаваць 5 школ.

Многа зрабіў Порплiскі Сялянскі камітэт у справе добраахвоснай уборкі ўраджаю з былшай панскай зямлі. Сяляне бесперабойна працуюць на абмалоце і расцілу лёну, праводзяць копку і захаванне бульбы. У большасці вёсак заканчваецца сяўба азімага жыта.

Разам з сельска-гаспадарчымі работамі, сялянскі камітэт удзяляе вялікую ўвагу культурна-масавай рабоце. У вёсках устанаўліваюцца, узятыя з панскіх маёнткаў, радыё-апараты. Арганізуецца калектыўныя слуханні апошніх паведамленняў са сталіцы Савецкага Саюза г. Масквы.

Вечарам, пасля працы, сяляне збіраюцца ў памяшканні былшага пастарунка і гутараць аб новым шчаслівым жыцці. Тут яны дзякуюць воінам Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, якая вызваліла іх ад шматгадовага памешчыцкага гнёту.

г. Глыбокае. **І. Капенкаў.**



Група рабочых скурзавода Штурмана, выбраных на агульным сходзе у Рабочую Гвардыю.

Фото. Сапіра.

У рабочую гвардыю выбралі лепшых рабочых

28 верасня на скур-заводе Штурмана-Штэйна адбыліся выбары ў Рабочую Гвардыю. На сходзе прысутнічала больш 60 чалавек.

Прысутныя ў сваіх выступленнях шчыра дзякавалі Чырвоную Армію, Совецкі Урад і таварыша Сталіна за аказаную дапамогу ў вызваленні ад панскага гнёту.

Сход выбраў 9 лепшых прадстаўнікоў рабочага калектыва завода ў рады Рабочай Гвардыі: Сабалеўскага, Краснера, Маскевіча, Таракінскага, Гурвіча, Гронберга, Хінскага, Сабалеўскага і Скупскага.

А. Сапір.

Збылася заветная мара

Работніцы кансервнай фабрыкі „Балтык" Камарская Р. і Цытран М. разказваюць аб сваім ранейшым жыцці наступнае.

Нашы гаспадары-уладары фабрыкі не глядзелі на нас як на людзей. Працавалі мы па 16 гадзін у дзень і атрымоўвалі за гэта мізэрную плату, якой нават не хапала на пражыццё. Кантроль прахадзіў міма фактаў бязмернай эксплаатацыі рабочых.

У халодныя дні, калі на дварэ стаяла сцюжа і мароз, гаспадыня выганяла нас з памяшканя і мы вымушаны былі мёрзнуць на дварэ.

Гаспадар прадпрыемства не толькі не лічыуся з голасам рабочых, але нават не лічыў патрэбным размаўляць з імі.

Сталовая і памяшканне, дзе абедалі рабочыя, былі заўсёды брудныя, раздзявальня ніколі не тапілася.

Гэтымі днямі на фабрыцы выбран рабочы камітэт з трох чалавек (Левін, Юрэвіч і Шабад) і двое рабочых для сувязі і дапамогі Часоваму Ўпраўленню. Камітэт ужо зрабіў першыя крокі па наладжванню працы на прадпрыемстве.

З прыходам Чырвонай Арміі збылася заветная мара рабочых, збылося тое, аб чым яны марылі толькі ў сне.

Цяпер мы чакаем таго дня, кажуць рабочыя гэтай фабрыкі, калі зможам падаць свой голас за далучэнне Заходняй Беларусі, да Вялікага Совецкага Саюза, падаць свой голас за ўстанаўленне совецкай улады ў нашай раней прыгнечанай краіне. Мы з вялікім нецярпеннем чакаем таго дня, калі кожны рабочы, раней бяспраўны і прыгнечаны з гордасцю зможа сказаць: „Я — грамадзянін Вялікага Совецкага Саюза".

А. Пінчук.

Героі-пагранічнікі

ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ, 28 верасня, (ТАСС.) ...Ноч на зыходзе. Першыя праблескі пачатку дня. Ціха, так ціха, што не чутно, як шалясціць лісцё. Пагранічнікі, нічым не паказваючы свайго ўнутранага ўздыма, з нецярпеннем чакалі моманта, калі яны выступяць у паход. Яны праслухалі баявы загад, гарачую прамову камісара.

Баец Семчанка падышоў да свайго друга — снайпэра Ланцова і запрапанаваў:

— Давай спаборнічаць.

Не паспелі яны падпісаць на скора зложаны сацыялістычны дагавор, як комсамольскі арганізатар склікаў усіх на сход. Перад боем трэба было разгледзіць заяву пагранічніка Капкунова, які пажадаў удзельнічаць у баі членам ленінска-сталінскага комсамола 3 пакоя, дзе адбываўся сход, байцы вышлі на вуліцу, быстра пастроіліся і рушылі ў дарогу.

Пагранічнікі павінны былі быстра захапіць і ліквідаваць заставы праціўніка, ачысціць дарогу для баявых аперацый Чырвонай Арміі.

Раніцай 17 верасня граніца засталася ззаду. Баец Семчанка і два старшыні, шчыльна прыпадаючы да зямлі, папаўзлі знімаць польскага вартавога. На заставе забрахаў сабака. Семчанка спыніўся, затрымоўваючы дыханне. Сабака змоўк. Маскіруючыся, байцы зноў папаўзлі насустрач польскаму стражніку. З кожнай секундай адлежнасць між імі скарачалася.

Дваццать мэтраў, дзесяць з паловай і момант калі Семчанка падняўся на ногі, спалоханы польскі вартавы быў акружан з трох бакоў. Услед за трыма смельчакамі ў баявым парадку рушылась уся ўдарная група. Зноў забрахаў сабака, забрахаў трывожна, настойліва. На варожай стражніцы замітусіліся. Чутна было, як нехта бег па ступеньках вышкі.

Ланцуг пагранічнікаў падышоў да самага плота стражніцы. Камандзір громка крыкнуў: — Вы акружаны... Супраціўленне бескарысна... Здавайцеся!..

У адказ застрачыў кулямёт, раздаліся вінтовачныя выстралы. Завязаўся гарачы бой. Чырвонаармейцы пад агнём праціўніка прыкладамі выбівалі вокны, з завес збівалі цяжкія дзверы, закідвалі супраціўляючыхся гранатамі. Снайпер Ланцоў меткім выстралам зняў з вышкі кулямётчыка. Семчанка падкраўся да аднаго з польскіх кулямётаў і меткім браском гранаты знішчыў яго. Уварваўшыся на ганак стражніцы, Семчанка першым трапіў у калідор. Два разы ранены куляй і асколкамі гранаты ён усё-ж не пакідаў месца боя. Па-таварыску і самаахвярна вёў сябе чырвонаармеец Белавак. Ён бачыў, як ранены баец Арлоў хіснуўся і ўпаў. Далікатна падняўшы раненага левай рукой, Белавак працягваў правай закідваць праціўніка гранатамі.

Каля адной з польскіх стражніц група чырвонаармейцаў была акружана падышоўшым атрадам праціўніка. Начальнік заставы старшы лейтэнант Земскаў кінуўся наперад са словамі: — У атаку. За Радзіму, за Сталіна!

Польская куля цяжка раніла старшага лейтэнанта. Камандзір, перамагаючы боль, аддаў загад прарваць акружэнне, заняць памяшканне стражніцы, захапіць дакументы, разграміць ворага. Байцы кінуліся ў атаку і, змятаючы заграджэнне палякаў, прымусілі іх здацца. Заданне выканана.

На ўсёй граніцы працягіваўся бой не больш 30—40 мінут.

За гэты параўнальна кароткі тэрмін совецкія пагранічнікі ліквідавалі ўсе польскія стражніцы. Узыходзіла сонца... Пагранічнікі вярталіся на зыходныя пазыцыі. Насустрач бясстрашным воінам, выканаўшым сваё баявое заданне, сакрушальнай лавінай ішлі танкавыя часці, пяхота, кавалерыя і артылерыя. У паветры грымелі маторы совецкіх самалётаў. Пачаўся нябачаны на свеце па сваёй імклівасці пабеданосны марш Чырвонай Арміі—вызваліцельніцы працоўных Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ад панскага ярма.

Квітнее соцыялістычная культура Беларусі

Адным з выдатных заваяванняу у жыцці працоуных нашай краіны з'яуляецца нябачана быстры рост іх культурнага узроуню, росквіт нацыянальнай па форме соцыялістычнай па свайму зместу культуры беларускага народа.

У царскай Расіі правячыя класы, памешчыкі і капіталісты, насаджалі цемру і невуцтва. Даць працоуным толькі нямнога самых прасцейшых ведау, але не дапусціць іх да сапраудных навуковых ведау—вось да чаго імкнулся эксплуататары. Яны смяротна баяліся авалодаушага навукай свядомага рабочага, селяніна — гэта магло пашкодзіць іх панаванню.

Непісьменных да рэволюцыі у Беларусі сярод усяго насельніцтва было 76,5 проц. у весцы 80 проц., а сярод жанчын селянак 92,3 проц.

Замест школ царскі урад лічыу за лепшае будаваць манапольні і цэрквы. У дарэволюцыйнай Беларусі было усяго 4000 школ усіх відау. Побач з гэтым у ей налічвалася 5000 манаполек, каля 400 цэркваў, касцелау і сінагог. Адных папоу, ксяндзоу і равінау было 6000.

З старых справаздач відаць, што, напрыклад, у Сенненскім павеце (не лічачы гор. Сянно) было у 1910 годзе 185 пачатковых школ і 94 царквы, касцелы і сінагогі; 199 настаунікау і 494 папы манахі, ксяндзы і равіны.

Але нават тыя дзеці, як'я пападалі у школу, рэдка давучваліся да канца і аканчвалі яе. Сельскія школы былі размешчаны далека ад весак. Дзяцей гарадской и сельскай беднаты не было у што апранаць зімой. Ды і бацькі, рабочыя і сяляне, скрозь і усюды не маглі пракарміць лішняга рота і часта самі вымушаны былі адрываць дзіця ад навучання у школе, прымушаючы яго працаваць на фабрыцы, у майстэрні або у сельскай гаспадарцы. З справаздач відаць, што па Беларусі у другі клас пераходзіла нямногім больш палавіны навучаючыхся пачатковай школы (54,3 проц.), у трэці клас — менш трэці (29,2 проц.). а у чацверты — менш шаснаццатай часці — (5,9 проц.).

Доступ для дзяцей працоуных у сярэднюю школу быу затруднен і непамерна высокай платай за вучэнне.

Навучанне у школах вялося выключна на рускай мове, беларуская мова праследвалася. Царскіе чыноунікі імкнуліся праз школу выхоуваць у дзецях пачуцце рэлігійнасці, цярпліваcці, пакорнасці пануючым класам. Калі перад віцебскімі памешчыкамі было пастаулена пытанне, як яны уяуляюць сабе задачы школы, яны далі наступны адказ: «Школа павінна усяляць у падрастаючае пакаленне рэлігійнасць, любоу да цара і бацькаушчыны, павагу да закона чужой уласнасці і існуючага парадку».

Так было у Беларусі да совецкай улады. Такое і зараз становішча у большасці капіталістычных краін, у прыватнасці у Заходняй Беларусі, якая стагнала пад гнетам польскіх акупантау. У радзе паветау Заходняй Беларусі непісьменнасць даходзіць зараз да 70 проц. усяго насельніцтва, а сярод жанчын — да 90 — 95 проц. У Заходняй Беларусі выкладанне вядзецца выключна на польскай мове, тут няма ні адной беларускай школы, у той час як у 1919 — 1920 гг. іх было звыш 400. Тут няма ні аднаго беларускага тэатра, клуба, бібліятэкі.

Толькі совецкая улада шырока адкрыла усім працоуным доступ да навукі і культуры. З першых дзен свайго існавання совецкая улада пачала узмоцнена будаваць школы, ліквідаваць непісьменнасць насельніцтва. Яшчэ не адгрымелі гарматы грамадзянскай вайны, а уся краіна Советау пакрылася густой сеткай школ, клубау, школ па ліквідацыі непісьменнасці.

Зусім змянілася культурнае аблічча Совецкай Беларусі. Краіна стала суцэльна граматнай.

Ахват дзяцей школамі выключна вялікі. Калі да рэволюцыі у школах Беларусі навучалася 294,3 тысячы дзяцей, то у 1939 г. у школах БССР на роднай мове навучаецца каля 1 мільена 100 тысяч дзяцей. Пры гэтым, кольнасць дзяцей у сярэдніх і няпоуных сярэдніх школах павялічылася у параунанні з дарэволюцыйным часам у 31 раз. За другую пяцігодку па БССР пабудаваны 543 школы на 95 тысяч месц. Настаунікау дарэволюцыйная Беларусь налічвала ледзь 7 тысяч. Зараз у Совецкай Беларусі навучае і выхоувае нашу шчаслівую совецкую дзетвару армія у 36 тысяч педагогау. З велізарным уздымам і натхненнем нашы настаунікі рыхтуюць змену барацьбітоу за коммунізм. Совецкі урад адзначыу адданасць педагогау сваей справе, партыі большэвікоу і вялікаму правадыру таварышу Сталіну Указам Вярхоунага Совета СССР ордэнамі і медалямі Совецкага Саюза узнагароджан 181 лепшы настаунік. Указам Вярхоунага Совета БССР 80 педагогам прысвоена званне заслужанага настауніка.

Працоуныя вучацца у школах для дарослых, у тэхнікумах, вышэйшых навучальных установах, на розных курсах і у школах па падрыхтоуцы кадрау (трактарыстау, камбайнерау, шоферау), у фабзавучах, у школах дарожных майстрау, у завочных вучэбных установах, нарэшце у школах стаханаускага вопыту, у масавых гуртках і на курсах тэхнічнага і агранамічнага навучання. Па нашых падліках, у БССР вучыцца не менш 1.300.000 чалавек (23,3 проц. усяго насельніцтва БССР).

Совецкі урад затрачвае штогод велізарныя сродкі на асвету мас. У капіталістычных краінах львіная доля бюджэта ідзе на ваенныя мэты. У СССР з кожным годам расце колькасць грашовых сум, якія асігнуюцца на патрэбы народнай асветы Калі у 1924-25 годзе на патрэбы асьветы у БССР трацілася 9,6 млн. руб., то у 1939 годзе асігнаванні на асвету выраслі да 609,4 млн. руб., г. зн. у 63,5 раза. На душу насельніцтва такім чынам трацілась у 1938 г. 110 руб., супроць 60 кап. у 1914 годзе.

У Беларусі да рэволюцыі не было ні адной вышэйшай навучальнай установы, ні адной навукова-даследчай установы. Зараз у 23 ВНУ БССР навучаецца звыш 16 тысяч студэнтау. Звыш 34 тысяч студэнтау вучыцца у 101 тэхнікуме нашай рэспублікі.

У капіталістычных краінах доступ у вышэйшую школу для працоуных вельмі затруднен, амаль немагчым. Так, напрыклад, у Германіі у 1933 — 1934 г. сярод студэнтау дзеці рабочых складалі 3,3 проц. дзеці ніжэйшых служачых — 2,7 проц., у той час як дзеці капіталістау, вышэйшых і сярэдніх чыноунікау — 60 проц. У вышэйшых школах капіталістычных краін за навучанне бяруць высокую плату, не гаворачы ужо аб тым, што на увесь час навучання трэба мець сродкі для жыцця. Зусім іншая справа у нас у Совецкай краіне. Навучанне у нас бясплатнае, а пераважная колькасць студэнтау СССР (90,6 проц. студэнтау ВНУ і 85.8 проц. навучаючыхся тэхнікумау) забяспечана дзяржаунай стыпендыяй. Гэта найвялікшае дасягненне працоуных зафіксіравана у Сталінскай Канстытуцыі.

«Грамадзяне СССР маюць права на асвету.

Гэта права забяспечваецца усеагульнаабавязковай асветай, бясплатнасцю асветы, уключаючы вышэйшую асвету, сістэмай дзяржауных стыпендый пераважнай большасці навучаючыхся у вышэйшай школе, абучэннем у школах на роднай мове, арганізацыяй на заводах, у соугасах машынна-трактарных станцыях і калгасах бясплатнага вытворчага, тэхнічнага і агранамічнага абучэння працоуных» (артыкул 121 Канстытуцыі СССР).

Каля 50 млн. рублей асігнавана па рэспубліканскаму і мясцоваму бюджету БССР на стыпендыі студэнтам. Гэта акрамя 15—20 млн. рублеу, адпускаемых на матэрыяльна бытавое абслугоуванне студэнтау (на пакупку цуцевак у санаторыі і дамы адпачынку, на экскурсіі, на адначасовую дапамогу, культурнае абслугоуванне і т. д.)

Дзеці рабочых і калгаснікау складаюць пераважную большасць студэнтау вышэйшых навучальных устаноу, тэхнікумау БССР. У саставе студэнтау, выпушчаных ВНУ БССР у 1937 годзе 65 проц. былі рабочымі, калгаснікамі і іх дзяцьмі, у саставе выпускнікоу тэхнікумау іх удзельная вага складала 84 проц.

Прыгнечаным нацыянальнсцям у капіталістычных краінах амаль зусім закрыт доступ у вышэйшую школу. У саставе насельніцтва Польшчы беларусы Заходняй Беларусі і украінцы Заходняй Украіны складаюць каля 11 мільенау. Колькасць беларусоу і украінцау у вышэйшых навучальных установах Польшчы нікчэмна, не больш 2,8 проц. усіх студэнтау.

У саставе-ж выпускнікоу ВНУ БССР у 1937 годзе беларусы складалі 63,2 проц., у саставе выпускнікоу тэхнікумау — звыш 80 проц.

У БССР створана 39 навукова-даследчых устаноу на чале з Акадэміяй Навук БССР, якая з'яуляецца центрам навуковай мыслі Совецкай Беларусі.

Вялікая работа праводзіцца на усіх фабрыках і заводах па павышэнню кваліфікацыі рабочых.

На Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстауцы, гэтай усенароднай школе, прадстаулена 29 соугасау, 273 калгасы, 233 жывелагадоучыя фермы, 40 пасек, 3911 перадавікоу сельскай гаспадаркі БССР. Гэтыя людзі перадаюць ужо свой вопыт іншым, з вучняу ператвараюцца у на-

(Працяг на 4 стар.).

Квітнее соцыялістычная культура Беларусі

(Канец, пачатак гл. на 3 стар.)

стаунікау, не спыняючы ні на адзін дзень сваю вучобу і далейшае удасканальванне.

Велізарная культурная, палітычна - асветная работа праводзіцца у створаных совецкай уладай шматлікіх бібліятэках клубах, кінотэатрах і іншых культурных установах. У велізарным размеры вырасла друкаваная прадукцыя, расшырылася літаратура і мастацтва беларускага народа.

Прывядзем некалькі лічбау. У 1938 годзе у БССР працавалі 15 тэатрау, 1133 кінаустановы (у тым ліку 491 гукавая), 2873 клубы і хаты-чытальні. Калі у дарэвалюцыйнай Беларусі у 1910 годзе выдавалася 11 газет (з іх толькі адна на беларускай і адна на яурэйскай мовах), то у 1938 годзе у БССР выдавалася ужо 199 газет і 14 журналау, з іх 149 газет і 9 журналау на беларускай мове.

Працоуныя БССР выпісваюць больш 200 тыс. экземпляру цэнтральных газет. У 1932 годзе на БССР было 22.893 радыетрансляцыйныя точкі, у 1939 годзе іх лік дасягнуу 114,8 тыс. Колькасць бібліятэк, уключаючы школьныя, вырасла у 1937 годзе да 9562, а іх кніжны фонд — да 10,6 млн. Адна толькі Дзяржауная бібліятэка імені Леніна у Мінску мае каля 2 млн. тамоу.

Кніга і газета з'яуляюцца цяпер ужо прадметам першай неабходнасці для пераважнай большасці працоуных. Поруч з народнымі паэтамі БССР, ордэнаносцамі Янкай Купала, Якубам Коласам, Змітраком Бядулем, стварыушымі свае лепшыя творы у годы совецкай улады, вырас рад новых, маладых, таленавітых пісьменнікау і паэтау, як ордэнаносцы М. Лынькоу, П. Броука, П. Глебка і інш., якія паказваюць у яркіх вобразах радаснае і шчаслівае жыцце працоуных Совецкай краіны.

У БССР створаны Кансерваторыя, 4 музыкальных вучылішчы, 10 музыкальных школ, тэатральнае і мастацкае вучылішчы. У гэтых школах навучаецца каля 5 тысяч чалавек. У нашай рэспубліцы працуюць Тэатр оперы і балета, Дзяржауная філармонія, Беларускі дзяржауны хор, ансамбль песні і пляскі і рад іншых установ, падрыхтоуваючых новыя кадры у галіне мастацтва.

Дасягнуты значныя поспехі у стварэнні беларускай оперы, якая адлюстроувае усе багацце народнай музыкі. На сцэне Беларускага опернага тэатра пастаулены оперы маладых совецкіх кампазітарау: Цікоцкага («Міхась Падгорны») і дэпутата Вярхоунага Совета БССР Багатырова («Дрыгва», па шырока вядомай аповесці Я. Коласа).

Расце народная самадзейнасць, шырока вядомасць набыла за межамі нашай рэспублікі беларуская народная творчасць. Калгаснік-самавучка тав. Арлоу зрабіу мастацка выкананы прыгожы сундук, у якім было паслана пісьмо беларускага народа таварышу Сталіну. У жніуні 1939 года на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстауцы з вялікім поспехам выступалі прадстаунікі мастацкай самадзейнасці самых аддаленых раёнау БССР. Самадзейны ансамбль песні і пляскі пры Хойніцкай МТС неаднаразова з вялікім поспехам выступау у Маскве, Мінску і Харкаве (дзе ён выйшау на першае месца у алімпіядзе рабочых машынатрактарных станцый).

Густая сетка культурных установ пакрывае цяпер усю нашу краіну, усе нават самыя аддаленыя яе куткі, якія лічыліся раней захалуснымі.

Вось тыповы для БССР калгас імені Тальмана, Брагінскага раена. Ён мае свой уласны клуб, бібліятэку, спартыуную пляцоуку, хату-лабараторыю. Усе дамы у калгасе радыефікаваны. Калгаснікі выпісваюць 102 экз. газет і журналау.

У калгасе імені Беларускай Асобай Ваеннай Акругі, Любанскага раена, пабудаваны няпоуная сярэдняя школа, клуб на 500 месц, гукавое кіно, радыевузел, есць бібліятэка, хата-лабараторыя і т. д.

З кожным годам растуць кадры совецкай інтэлігенцыі, вышаушай з самой гушчы народных мас. За годы свайго існавання калгас імені Варашылава, Слуцкага раена, дау краіне 6 ветурачоу, 10 настаунікау, 2 інжынерау, 2 урачоу, 5 камандзірау РСЧА; у вышэйшых навучальных установах вучыцца 15 калгаснікау.

Так расцвіла нацыянальная па форме соцыялістычная па змесцу культура беларускага народа.

Беларускі народ, як і усе народы вялікага Совецкага Саюза, ідзе пад слауным сцягам Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна да ззяючых вяршынь комунізма.

Я. Г. РАКАУ. С. Н. МАЛІНІН.

Сустрэча совецкіх пісьменнікаў з інтэлігенцыяй Беластока

БЕЛАСТОК, 28 верасня (ТАСС), Больш тысячы прадстаўнікоў інтэлігенцыі сабраліся на літаратурны вечар — сустречу з совецкімі пісьменнікамі. Мастакі, настаўнікі, урачы запоўнілі прасторны зал гарадскога тэатра.

Апладысментамі сустрэлі сабраўшыяся паяўленне ў прэзідыуме совецкіх пісьменнікаў таварышоў: Ільенкова, Ісбаха, Слесарэва, Лынькова. Пісьменнікам прэпаднеслі вялікія букеты жывых кветак. Калі тав. Ісбах, адчыняючы вечар, праізнёс імя таварыша Сталіна, усе ўсталі. Доўга не змаўкалі прывітальныя воклічы ў чэсць вялікага Правадыра народаў.

— Імёны Маякоўскага, Талстога, Шолахава — знаёмы працоўным Беластока таксама, як і імёны класікаў рускай літаратуры, — заявіў тав. Ісбах. — І сіла совецкай літаратуры заключаецца ў тым, што яна літаратура народа-вызваліцеля, стварыўшага сваю недасягаемую соцыялістычную культуру.

Беларускі пісьменнік-ордэнаносец тав. Міхась Лынькоў перадаў прывітанне беларусам, яўрэям і палякам Беластока ад рабочых і інтэлігенцыі горада Мінска і ўсёй Совецкай Баларусі.

— Вось ужо некалькі дзён, як мы жывем у гэтым вялікім беларускім горадзе, — сказаў тав. Лынькоў. — Мы ўбачылі тут прыгожыя дамы, паркі і скверы ў цэнтры горада і пахіліўшыеся дамы — на акраінах. Мы, аднак, не бачылі ні адной вышэйшай установы. Іх няма. Але пройдзе нямнога часу, і юнацтва горада будзе вучыцца ў сваіх інстытутах. Родны беларускі народ на сваёй роднай зямле будзе ствараць сваю культуру, культуру народа-пераможца.

Пісьменнікі т. т. Ісбах і Ільенкоў чыталі свае творы, а таксама вершы, знаходзячыхся на беларускім фронце паэтаў т. т. Кірсанава і Далматоўскага. Чырвонаармейскі паэт тав. Слесарэў закончыў свае выступленне вершам, які ён напісаў у Беластоку.

Бурнымі авацыямі былі сустрэты словы:

„Пой-же песню легко и широко,
Вольный брат, в этот радостный час,
Чтоб она от полей Белостока
Ваш привет до Москвы донесла".

—:::—

Аднавіць работу фабрыкі

Днямі адбыўся сход рабочых і работніц ільнянай фабрыкі „Фіброза". На сваім сходзе рабочы калектыў фабрыкі абмеркаваў пытанне аб хутчэйшым пуску фабрыкі і выбарах рабочага камітэта.

Выступаўшыя ў спрэчках рабочыя і работніцы адзначалі, што гаспадар фабрыкі Левін і ўпраўляючы Хволес не прымаюць ніякіх мер, каб хутчэй пусьціць фабрыку.

Агульны сход пастанавіў патрабаваць ад гаспадароў фабрыкі ў бліжэйшыя дні арганізаваць загатоўку ільнотрасты і пусціць фабрыку на поўны ход. Рабочыя і работніцы фабрыкі пастанавілі таксама хадатайнічаць перад кіраўнікамі фабрыкі «Фіброза» аб выдачы рабочым грашовай дапамогі ў лік будучай зарабатнай платы ў сувязі з тым, што фабрыка ўжо каля трох месяцаў не работае і многія рабочыя ўвесь гэты час з'яўляюцца беспрацоўнымі.

На сваім сходзе калектыў рабочых і работніц фабрыкі выбраў рабочы камітэт з пяці чалавек.

Паведамленне ТАСС

аб ратыфікацыі Совецка-Эстонскага пакта аб узаемадапамозе Прэзідыумам Вярхоўнага Совета СССР

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР 29 верасня ратыфіцыраваў Совецка-Эстонскі пакт аб узаемадапамозе, заключаны ў Маскве 28 верасня г. г.

Ад'езд з Масквы міністра замежных спраў Германіі г-на Іоахіма фон Рыбентропа

29 верасня г. г. з Масквы вылецеў міністр замежных спраў Германіі г-н Іоахім фон Рыбентроп, у суправаджэнні гг. Форстэра, Гаўса, Шнуррэ і інш. На цэнтральным аэрапорце міністра праводзілі намеснік Народнага Камісара замежных спраў таварыш В. П. Пацёмкін, нам. старшыні Моссовета тав. М. Я. Ясноў, паўпрэд СССР у Германіі тав. А. А. Шварцэў, загадчык пратакольнага аддзела Народнага Камісарыята замежных спраў тав. В. Н. Баркоў, загадчык цэнтральнага еўрапейскага аддзела НКЗС тав. А. М. Александраў, першы сакратар паўпредства СССР у Германіі тав. В. Н. Паўлаў, камендант горада Масквы палкоўнік тав. Ф. І. Сувораў, увесь састаў германскага пасольства ў Маскве, на чале з чрэзвычайным і паўнамочным паслом г. фон-дэр Шуленбургам, і чрэзвычайны і паўнамочны пасол Італіі г-н Россі.

Цэнтральны аэропорт быў упрыгожан совецкімі і германскімі сцягамі. Для провадаў міністра быў выстаўлен пачотны караул (ТАСС).

Перабpоска германскіх войск з усходняга на заходні фронт

БЕРЛІН, 29 верасня (ТАСС). Учора вечарам праз Берлін прайшла вялікая колькасць паяздоў з германскімі войскамі, якія варочаюцца з усходняга фронта. Ваенныя транспарты следуюць у заходнім напрамку.

Артыкул Лойд Джорджа

ЛОНДАН, 29 верасня, (ТАСС). Учора газета „Іоркшыр пост" апублікавала артыкул Лойд Джорджа, які з'яўляецца адказам на пісьмо польскага пасла ў Лондане Рачынскага. Гаворачы аб былым польскім урадзе Лойд Джордж піша: „Я прэзіраю ўрад, які для ўласнай безапаснасці ўцёк у чужую краіну, у той час, калі яго салдаты працягваюць змагацца".

Лойд Джордж заяўляе, што „польскае сялянства жыве ў глыбокім жабрацтве дзякуючы таму, што яно было ва ўладзе самай горшай легальнай сістэмы ў Еўропе. Вось чаму, піша Лойд Джордж, насельніцтва вітае Чырвоную Армію, як сваю вызваліцельніцу".

Заместны друк аб узаемаадносінах СССР с Германіяй і Эстоніяй

Германія

БЕРЛІН, 29 верасня, (ТАСС). Газета „Фелькішэр Беобахтэр" у перадавіцы піша: „Ворагі доўгі час прабавалі выкапаць глыбокую прапасць паміж двума вялікімі дзяржавамі. Яны хацелі сутыкнуць Совецкі Саюз з Германіяй. Англа-французскія спробы разглядаць рускіх, як гарматнае мяса для дасягнення англійскіх імперыялістычных мэтаў, не ўдаліся. Германія і СССР сталі на шлях дружаскіх адносін. Папярэднія напружаныя адносіны, якія наносілі цяжкі эканамічны ўшчэрб абедзьвум краінам, падверглíся рэвізіі, а цяперашняе германска-совецкае супрацоўніцтва павінна разглядацца, як радыкальны паварот.

У сувязі з велізарнымі магчымасцямі развіцця эканамічных, гандлёвых і палітычных адносін паміж абедзьвума краінамі — заканчвае газета — Германія ахвотна хоча ісці шляхам цеснага супрацоўніцтва з Совецкім Саюзам, шляхам, які азначае сапраўдны паварот у гісторыі Еўропы"

Эстонія

ТАЛІН, 29 верасня (ТАСС). Сённешнія эстонскія газеты друкуюць на першых старонках тэкст пакта аб узаемадапамозе паміж СССР і Эстоніяй. Буйныя загалоўкі газеты „Пяванехт" выдзяляе чырвонай фарбай. Газета змяшчае партрэты т. т. Сталіна, Молатава, Варашылава, Мікаяна. Газеты „Уус Эсці" і „Пяванехт" вышлі з павялічанымі тыражамі.

Насельніцтва з задавальненнем прыняло паведамленне аб заключэнні пакта ўзаемадапамогі паміж СССР і Эстоніяй. Гэты пакт, заяўляюць у кругах перадавой інтэлігенцыі, ярка выражае паслядоўнасць палітыкі Совецкага Ўрада ў справе абароны міра народаў. Насельніцтва Эстоніі цяпер атрымала моцную ўпэўненасць у мірным жыцці. Весткі аб стварэнні совецкіх марскіх і паветраных баз успрымаюцца як рэальнае ўмацаванне міра.

Латвія

РЫГА, 29 верасня, (ТАСС). Грамадская думка з нецярплівасцю чакала рэзультатаў перагавораў паміж СССР і Германіяй і паміж СССР і Эстоніяй. Ранішнія газеты паспелі апублікаваць паведамленне аб пакце ўзаемадапамогі паміж СССР і Эстоніяй. У дзённых выпусках газет надрукаван поўны тэкст германа-совецкага дагавора аб дружбе і пакта ўзаемадапамогі паміж СССР і Эстоніяй. Заяўленне Совецкага і Германскага ўрадаў, пісьмо таварыша Молатава і адказ Рыбентропа. У коментарыях эстонскай прэсы к пакту аб узаемадапамозе паміж СССР і Эстоніяй падкрэсліваецца, што пакт канчаткова ўрэгуліруе адносіны паміж СССР і Эстоніяй і што ён задаволіць абодва бакі.

Балгарыя

СОФІЯ, 29 верасня (ТАСС). Балгарскія газеты „Днес" і „Дневнік" публікуюць германа-совецкі дагавар аб дружбе і другія дакументы, а таксама тэкст совецка-эстонскага пакта аб узаемадапамозе. Афіцыёз „Днес" у перадавым артыкуле між іншым піша: „Сёння ніхто не адмаўляе, што ў рэзультаце рэвалюцыі ўзнікла вялікая дзяржава, якая арганізавала сваю дзяржаўную гаспадарку, дала прасторы творчым сілам і стварыла наймацнейшую армію ў свеце.

Руская палітыка — прадаўжае афіцыёз — імкнецца да ўстанаўлення дружбы з народамі. Гістарычнай місіяй Расіі, з'яўляецца творчая праца для мірнага садзейнічання эканамічнай і палітычнай сістэмы нашай эпохі".

—оОо—

Становішча на заходнім фронце

ХЕЛЬСІНКІ, 29 верасня (ТАСС). Парыжскі караспандэнт „Хельсінгін Саномат" перадае некаторыя падрабязнасці аб падзеях, адбыўшыхся ўчора на заходнім фронце. З раніцы нямецкія войскі пачалі вялікае наступленне на французскія пазіцыі паўднева-ўсходней ад Саарбрюкена з мэтай адагнаць французаў на іх ранейшыя пазіцыі. На працягу ночы германскія войскі фарсіравалі тэрыторыю ў раёне Інгберта і Нейкірхана і пачалі наступленне недалёка Бішмісхейма і Омерсхейма. На досвітку пад прыкрыццём танкаў яны нечакана пачалі ваенныя дзеянні і перасеклі дарогу Саарбрюкен-Асвейлер. Агнём французскай артылерыі прасоўванне было прыпынена. Ёсць многа прымет, — піша берлінскі караспандэнт „Хельсінгін Санемат", — што Германія вядзе падрыхтоўку да большых ваенных аперацый супроць заходніх дзяржаў. Дзеянні пачынаюцца ў тым выпадку, калі прапановы аб міру не будуць прыняты. Прадпалагаюць, што будзе ўсілена падводная вайна, каб сарваць англійскую блакаду, а таксама актывізіраваны дзеянні авіяцыі — усілены нападзенні на ваенныя караблі Англіі і іншыя ваенныя аб'екты праціўнікаў.

Землятрасенне ў Турцыі

НЬЮ-ЁРК, 27 верасня, (ТАСС). Як паведамляе агенцтва „Ассошыэйтед Прэсс" з Стамбула, землятрасенне ў Турцыі ўсілілася, захапіўшы раён астравоў Эгейскага мора — Сантарыно і Мітылены.

Спачуванне Совецкага Урада Турэцкаму Ураду

АНКАРА, 28 верасня, (ТАСС). Сёння паверанны ў справах СССР у Турцыі тав. Мікітнікаў перадаў турэцкаму прэм'ер-міністру Рэфіну Сайдаму спачуванне Совецкага Ўрада з прычыны зямлетрасення ў Ізмірскім раёне.

Адказны рэдактар І. М. ОФЕНГЕЙМ.

Паведамленне

Сёння, 30.IX. 1939 года, у гарадскім тэатры (Вялікая Пагулянка) адбудзецца нарада выбраных рабочых троек па прадпрыемствах г. Вільно і Н. Вілейкі, а таксама рабочых двоек па сувязі з Часовым Упраўленнем.

Пачатак роўна ў 4 (16) гадзіны па мясцоваму часу.

Часовае Упраўленне

Даю ўрокі рускай мовы па правапісу, прынятым ва ўсіх школах СССР.

Арганізую групы. Адрас: вул. Якуба Ясінскага 15, кв. 1.

---

30 верасня ў 8 гадзін раніцы па мясцоваму часу ў кіно „МУЗА" адбудзецца агульны сход шаўцоў-механікаў, а таксама ручных і загатоушчыкаў горада Вільно.

З 2 кастрычніка пры Віленскай Рускай Пушкінскай гімназіі адчыняюцца вячэрнія курсы рускай мовы з дадатковым курсам геаграфіі, гісторыі і асноў адміністрацыйнага ўстройства СССР.

Даведацца ў канцыляры гімназіі — Астрабрамская, 29.

З 1.X-39 г. у г. Вільно, Вялікая 2, кв. 1, арганізуюцца курсы моў: англійскай, французскай, нямецкай і рускай.

Атрымаць даведкі і запісацца на курсы можна штодзённа з 10 да 12 і з 4 да 7 гадзін.

Інстытут Германістыкі.

Рэволюцыйна-гістарычны совецкі фільм

„Чалавек з ружжом"

вытворчасць „Ленфільм" пачынае дэманстрыравацца ў Кінотэатры „Гэліос".

Акрамя карціны гледачы ўбачаць кіножурнал „Песня аб Кахоўцы".

Пачатак сеансаў у 1, 3, і 5,50 па мясцоваму часу.

Цэны месцам: 50 грошай, 1 злоты і 1 злоты і 50 грошай.

---

29 верасня згублен дыплом Юрэўскага Дзяржаўнага Універсітэта і дыплом Віленскага Універсітэта, выданыя на імя Андрушкевіча Антона Іосіфавіча.

Прашу звярнуць за ўзнагароду.

Адрас: Нова-Вілейка, вуліца 3 Мая, дом 4/2, Андрушкевіч.

Адрас рэдакцыі і друкарні: вул. Епіскопа Бандурскага 4. Тэл. 79 і 99.